**ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў”**

**Маніторынг: “Асвятленне прэзідэнцкіх выбараў 2010 г.
у беларускіх СМІ”**
(1 – 20 лістапада 2010 г.)

**Бюлетэнь №2**
*23 лістапада 2010 г.*
Мінск, Беларусь

## 1. Уводзіны

У справаздачы падсумоўваюцца дадзеныя другога этапа маніторынгу беларускіх электронных і друкаваных СМІ датычна асвятлення прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі.

Згодна з планам Цэнтральнай выбарчай камісіі (ЦВК) Рэспублікі Беларусь, у гэты перыяд ажыццяўлялася праверка сапраўднасці подпісаў за патэнцыйных кандыдатаў. А таксама адбылася іхняя рэгістрацыя.

## 2. Падсумаванне вынікаў

- У дзяржаўных электронных і друкаваных СМІ тэма прэзідэнцкіх выбараў заставалася маргінальнай нягледзячы на тое, што некаторыя медыя павялічылі да яе сваю ўвагу.

- Агульная карціна асвятлення выбарчай кампаніі таксама істотна не змянілася. Галоўнымі яе актарамі былі дзеючы прэзідэнт, неперсаніфікаваны суб’ект “улада”, ЦВК і тэрытарыяльныя камісіі, дзейнасць якіх ацэньвалася станоўча.

- Дзяржаўныя СМІ працягвалі ігнараваць іншых патэнцыйных кандыдатаў на пасаду прэзідэнта. А мінімальная ўвага да іх была выклікана працэдурай рэгістрацыі ў заключны перыяд маніторынгу. Гэткім чынам, пазітыўнае пазіцыянаванне дзеючага прэзідэнта, ягонае выразна дамінантнае становішча ў дзяржаўных СМІ – частка агульнай стратэгіі асвятлення выбарчага працэсу. А яе адваротны бок – маргіналізацыя ўсіх астатніх прэтэндэнтаў, асобы і прозвішчы якіх засталіся невядомымі для спажыўцоў дзяржаўных медыя.

- Як і ў папярэдні перыяд, тыя ж медыя "праграмавалі" вынікі галасавання праз шматлікія спасылкі на вынікі сацыялагічных апытанняў, часам без указання канкрэтных інстытуцый, што гэтыя апытанні праводзілі. Ды асвятлялі выбарчы працэс, выразна ігнаруючы прынцыпы журналісцкай этыкі і міжнародна прызнаныя стандарты.

- На старонках недзяржаўнай прэсы былі заўважаныя практычна ўсе патэнцыйныя кандыдаты. А падаваная карціна выбарчага працэсу ўлучала значна больш розных суб'ектаў параўнальна з дзяржаўнымі медыя.

- У манітарынгаваных недзяржаўных газетах не выяўлены выпадкі перакручвання, скажэння інфармацыі ці тэндэнцыйнага асвятлення.

3. **Асноўныя дадзеныя**

**3.1 Дзяржаўныя медыя**

Навінавая праграма **"Панарама" (**Першы нацыянальны канал Беларускага тэлебачання) яшчэ больш акцэнтавала ўвагу на дзейнасці кіраўніка краіны амаль 85% часу параўнальна з усімі іншымі суб'ектамі маніторынгу супраць 75% у папярэдні перыяд. Другім значным суб'ектам з'яўляецца ЦВК (амаль 11% часу). Увага да дзейнасці астатніх суб'ектаў вагаецца ў межах 1%. Прэзідэнт Лукашэнка і яго дзейнасць былі рэпрэзентаваныя пераважна станоўча. Пераважна станоўча праграма ацаніла і дзейнасць ЦВК.

Тэме выбараў на гэты раз было адведзена больш часу, чым у папярэдні перыяд: 3% (раней гэты паказчык складаў 0,86% часу). Гэта па часе столькі ж, колькі прысвечана прагнозу надвор'я. А галоўнай тэмай праграмы была падрыхтоўка да правядзення Еўрабачання. 19.11.10 праграма распачала свой выпуск словамі: *"Шоу, которым живёт вся страна. Президент сегодня поднялся на сцену детского Евровидения".* І сапраўды, час, адведзены розным сюжэтам на гэтую тэму, складае за гэты перыяд маніторынгу 1 гадзіну 12 хвілін, альбо амаль у 3 разы болей за час, адведзены выбарчай тэматыцы.

Параўнальна з папярэднім этапам маніторынгу праграма **"Наши новости"** АНТ таксама павялічыла ўвагу да тэмы выбараў (6,8% супраць 3,3% часу суадносна з іншымі рубрыкамі). Аднак не прадэманстравала хоць якога прагрэсу ў справе асвятлення дзейнасці патэнцыйных кандыдатаў – супернікаў А. Лукашэнкі. Так, дзеючы прэзідэнт прысутнічаў на экране амаль 54 хвіліны, а астатнія (за

выняткам Рымашэўскага) прэтэндэнты на пасаду кіраўніка краіны ўсе разам мелі толькі крыху болей за 2 хвіліны.

Праграма **“Радыёфакт”** Першага нацыянальнага канала дзяржаўнага радыё галоўнымі дзеючымі асобамі зрабіла ЦВК і прэзідэнта А. Лукашэнку. Пры гэтым характэрнай асаблівасцю як “Радыёфакту”, так і шэрагу іншых дзяржаўных медыя было асвятленне іншых кандыдатаў на пасаду прэзідэнта ў якасці неперсаніфікаванага суб’екта.

Паводле версіі праграмы **“Навіны Рэгіён”** (тэлерадыёкампанія “Магілёў”), галоўнымі актарамі, што маюць непасрэднае дачыненне да выбарчага працэсу, былі А. Лукашэнка (41%), абласная камісія (29%) і неперсаніфікаваны кандыдат (10%). А тэме выбараў праграма адвяла 2,1% часу, крыху болей, чым у папярэдні перыяд (1,6%).

У ранейшым ракурсе асвятляў выбарчы працэс сайт беларускага агенцтва навін **БелТА**. То бок, асноўную ўвагу ён надаваў дзейнасці ЦВК і дзеючага прэзідэнта і маргіналізаваў астатніх патэнцыйных кандыдатаў. Гэтак жа сама як і “Радыёфакт”, сайт БелТА пісаў галоўным чынам пра неперсаніфікаваных кандыдатаў, апанентаў Лукашэнкі, не называючы іхніх прозвішчаў.

**“Советская Белоруссия”** (“СБ”**)**, як і ў папярэдні перыяд, звярнула ўвагу толькі на аднаго патэнцыйнага кандыдата (каля 61% плошчы параўнальна з усімі іншымі суб’ектамі) і праігнаравала астатніх. Пры гэтым павялічыла ўвагу да дзейнасці ЦВК (22,1% супраць11,3% у папярэдні перыяд) і прадэманстравала меншую цікавасць да апазіцыі, якую рэпрэзентавала галоўным чынам адмоўна. А. Лукашэнку і ягоную дзейнасць газета ацаніла пазітыўна.

Газета “**Рэспубліка**” яшчэ больш увагі (у абсалютных лічбах), параўнальна з “СБ”, надала ЦВК. Газета абмежавалася асвятленнем дзейнасці яшчэ пяці суб’ектаў – дзеючага прэзідэнта (амаль 35% параўнальна з астатнімі актарамі), улады (амаль 39%), абласной камісіі (5%), заходніх назіральнікаў (1,2%) і назіральнікаў з краін СНД (0,6%).

### 3.2 Недзяржаўныя медыя

Асвятленне выбарчага працэсу газетай **“Комсомольская правда в Беларуси”** мала чым адрознівалася ад папярэдняга. Асноўную ўвагу яна надала ЦВК і дзеючаму прэзідэнту, а пра астатніх патэнцыйных кандыдатаў толькі ўзгадала.

Інтэрнет-газета **naviny.by,** як і раней, падала шырокую карціну выбарчага працэсу, што складаецца з асвятлення дзейнасці 43 суб'ектаў выбарчай кампаніі. Прычым патэнцыйныя кандыдаты былі несумненна заўважныя, хаця і крыху страцілі ва ўвазе інтэрнэт-рэсурса. Усе суб'екты пры гэтым ацэньваліся збалансавана, г. зн. як нейтральна, так і пазітыўна ці адмоўна ў некаторых выпадках.

У газеце **"Наша ніва"** патэнцыйныя кандыдаты крыху страцілі ва ўвазе да сябе. Але, як і раней, відавочным лідарам быў сп. Някляеў (25% плошчы параўнальна з астатнімі суб'ектамі). Найбліжэйшы ягоны канкурэнт А. Лукашэнка мае крыху болей за 14%. Праўда, на гэты раз сп. Някляеў рэпрэзентуецца прыкладна ў аднолькавых долях нейтральна і негатыўна. Гэтак жа сама як і А. Лукашэнка.

Газета "**Народная Воля"**, як і ў папярэдні перыяд, асноўную ўвагу надала ўладзе (амаль 35%), да якой паставілася галоўным чынам крытычна. Што да патэнцыйных кандыдатаў, дык крыху больш за дзесяць адсоткаў плошчы (параўнальна з астатнімі суб'ектамі) атрымаў А. Лукашэнка, 9% Кастусёў, амаль 7% − Раманчук, па аднаму з невялікім адсоткаў атрымалі Някляеў і Саннікаў, і амаль 0,4% Ус.

Газета "**Белорусы и рынок"** крыху павялічыла сваю ўвагу да патэнцыйных кандыдатаў**.** Як і ў папярэдні перыяд, ацэнка розных суб'ектаў дастаткова збалансаваная.

## 4. Медыяэфекты

Пад гэтым тэрмінам мы разумеем выпадкі перакручвання, скажэння інфармацыі, няпоўнага, аднабаковага ці тэндэнцыйнага асвятлення фактаў з мэтай паўплываць на меркаванні чытачоў (выбарцаў).

Вось толькі некаторыя з такіх выпадкаў.

### Прэпараванне інфармацыі на карысць дзеючай улады.

Так, *БелТА 04.11.10* падала наступны матэрыял (http://www.belta.by/ru/all_news/politics/Evrosojuz-otmechaet-bolee-svobodnyj-xarakter-nyneshnej-kampanii-po-vyboram-Prezidenta-Belarusi_i_530196.html): "*Евросоюз отмечает более свободный характер нынешней кампании по выборам Президента Беларуси. Об этом заявил сегодня журналистам в Минске депутат германского Бундестага, глава ведомства федерального канцлера ФРГ,*

*федеральный министр по особым поручениям Рональд Пофалла, передает корреспондент БелТА.*

*"Мы видим улучшение ситуации в Беларуси. Те ограничения, которые существовали раньше, в частности при сборе подписей потенциальных кандидатов, сейчас отсутствуют", − сказал он.*

*Рональд Пофалла отметил, что частью свободных и честных выборов являются определенные стандарты, такие как отсутствие различных препятствий при регистрации кандидатов в президенты, сбалансированность в избирательных комиссиях, а также доступ международных наблюдателей. Он также сказал, что будет внимательно следить за ходом избирательной кампании. По его мнению, нынешний политический климат абсолютно отличается от предыдущих лет".*

Аднак інфармацыйная агенцыя не падала другую частку ягоных выказванняў, што ў той жа дзень прыняла інтэрнет-газета naviny.by (http://naviny.by/rubrics/elections/2010/11/04/ic_media_video_623_4894/) у матэрыяле "***Рональд Пофалла: нормальных принципов для свободных выборов в Беларуси нет":***

*"Этап сбора подписей за кандидатов в президенты Беларуси в ходе нынешней кампании, считает министр, был более свободным по сравнению с предыдущими выборами.*

*Однако сравнивать предвыборную ситуацию в Беларуси с другими европейскими странами невозможно, отметил он. «За несколько недель до выборов не знать, кто является кандидатом в президенты, — это, конечно, большой недостаток. Мы видим положительные тенденции в Беларуси, но все равно придерживаемся мнения, что нормальных принципов для свободных выборов здесь нет», — заявил Пофалла".*

**Няпростая агітацыя на карысць незарэгістраванага кандыдата.** Праграма "Радыёфакт", Першы нацыянальны канал радыё, *09.11.10* , г. зн. за дзевяць дзён да афіцыйнай рэгістрацыі кандыдата, падала інфармацыю пад назвай *"Беларусы Малдовы заявілі пра падтрымку Лукашэнкі на выбарах"*. Прычым такая заява была зроблена ад імя ўсіх беларусаў Малдовы. У той жа дзень у нататцы "Мне не безразлично" "Гомельская праўда"*( №171 (22442)* падала наступнае меркаванне: *"Мне не безразлично, какое будущее ожидает родных, близких и весь наш народ. Поэтому я за нашего Президента А. Г. Лукашенко стою горой. Пусть ангел и Бог берегут его и хранят за*

*то, что от перестройки он наш народ уберег. Чтоб звезда ему сияла до 100 лет, чтоб люди добрые за ним шли и родную Беларусь берегли*".

**Факусаванне ўвагі на адным кандыдаце.** *18.11.10* агенцыя *БелТА* падала матэрыял пад загалоўкам **"***Лукашенко зарегистрирован кандидатом в президенты"***,** хаця гаворка ідзе па рэгістрацыю яшчэ дзевяці кандыдатаў (іхнія прозвішчы прыгадваюцца ў артыкуле).

**Маргіналізацыя і дыскрэдытацыя апазіцыйных патэнцыйных кандыдатаў.** Вядоўца Юры Пракопаў разважае ў эфіры тыднёвай аналітычнай праграмы *"В центре внимания"* ад *14.11.10*: "*Впервые реальные шансы стать кандидатами имеют сразу 10 человек. Хотя и по данным социологов, и по мнению экспертов, и даже по прикидкам самих претендентов у девяти из десяти кандидатов шансы завоевать доверие избирателей практически равны нулю. Рейтинг всех соперников Лукашенко не превышает одного процента.*

*Теперь оппозиция ломает голову, как красиво избежать позора. Традиционно надежды возлагаются на митинги после выборов. Но так как призывы выходить на площадь непонятно ради чего и ради кого не интересуют даже идейных, оппозиция не брезгует мошенничеством. Через интернет рассылаются письма, в которых политическая акция преподносится как культурное мероприятие. Но даже на эту уловку надежды нет, поэтому для создания массовости на площадь пригласили радикалов из России, коль скоро приличные люди белорусской оппозиции сторонятся*".

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## БТ/"ПАНАРАМА"
## 01.11.2010 – 20. 11.2010

Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)







Выбарчы працэс
3,01%
Спорт
17,62%
Надвор'е
3,29%
Іншае
76,08%

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## ОНТ/"Наши Новости"
## 01.11.2010 – 20. 11.2010

Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)







Спорт
13,57%
Выбарчы працэс
6,81%
Надвор'е
3,73%
Іншае
75,90%

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## “РЭСПУБЛІКА”
## 01.11.2010 – 20. 11.2010

Адзінка вымярэння – см. кв.






# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## “Гомель FM”, радио 101.3 FM, «Новости»
## 01.11.2010 – 20. 11.2010

Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)







Спорт
6,46%
Выбарчы працэс
1,63%
Іншае
91,91%

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## "МОГИЛЕВСКАЯ ПРАВДА"
## 01.11.2010 – 20. 11.2010

Адзінка вымярэння – см. кв.






# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## “НАША НІВА”
## 01.11.2010 – 20. 11.2010

Адзінка вымярэння – см. кв.






# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## “КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА”
## 01.11.2010 – 20. 11.2010

Адзінка вымярэння – см. кв.






# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## NAVINY.BY
## 01.11.2010 – 20. 11.2010

Адзінка вымярэння – колькасць знакаў




